Шыфр:_______________________ Зацвярджаю

Колькасць балаў:_______________ Намеснік старшыні арганізацыйнага камітэта намеснік Міністра адукацыі

Месца:______________________ _______________Р.С. Сідарэнка

«06» 03 2015 года

ЗАКЛЮЧНЫ ЭТАП XXXI РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ
ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА»
І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Мінск, 2015 г.*

**9 клас**

| **Заданні** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

**Варыянт I**

**Заданне 1.** «Пазнайце» запазычаныя словы па лексічных значэннях і даведках аб паходжанні. Упішыце словы ў табліцу.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*
(1 бал – за кожнае правільна запісанае слова;
0,5 бала – калі ў слове дапушчана арфаграфічная памылка)

| **Значэнне слова** | **Даведка аб паходжанні** | **Слова-адказ** |
|---|---|---|
| Аздараўленчая методыка, якая дазваляе дасягнуць добрага фізічнага стану шляхам спалучэння спецыяльных фізічных практыкаванняў са збалансаваным харчаваннем. | англ. *fitness* – гатоўнасць, трываласць, натрэніраванасць | |
| Электрычны прыбор для прыгатавання тостаў. | англ. *toaster* | |
| Тэлевізійнае інтэрв`ю (тэледыскусія) з якой-небудзь вядомай асобай (палітыкам, грамадскім дзеячам, акцёрам і г.д.) або з групай такіх асоб, прысвечанае актуальнай, грамадска значнай праблеме, як правіла, у прысутнасці гледачоў у спецыяльна абсталяванай студыі. | англ. *talk show* | |

| | | |
|---|---|---|
| 1. Від спорту, які заключаецца ў катанні з адначасовым выкананнем разнастайных трукаў, стоячы на спецыяльнай ролікавай дошцы.<br>2. Кароткая дошка на роліках для такога катання. | англ. *skateboard*, ад *skate* – каціцца, *board* – дошка | |
| Папка з наборам матэрыялаў (у тым ліку фотаздымкаў), якія даюцца патэнцыяльнаму работадаўцу з мэтай прадэманстраваць свае ўменні і навыкі ў пэўнай галіне. | іт. *portfoglio* – партфель | |

**Заданне 2.** У кожным сказе выберыце з дужак слова, якое падыходзіць па сэнсе, падкрэсліце яго.

*Максімальная колькасць балаў – 5*
(1 бал – за кожнае правільна падкрэсленае слова)

1. Але і ў звычайныя добрыя часы ўсе, хто прыязджае да нас, адзначаюць як адну з галоўных рыс – **(гасціннасць / гасцяванне)**… (*У. Караткевіч*).

2. Акрамя таго, Максіму даўно здавалася, што гаварун і весяльчак гэты хавае ад усіх нейкую **(асабістую / асабовую)** трагедыю (*І. Шамякін*).

3. Якую трэба мець **(адданасць / аддачу)** і сэрца сынава, каб так любіць палескі край туманны і маці бедны андарак (*П. Панчанка*).

4. Калі ўжо Мікалай Міхайлавіч сам рашыў, што трэба ехаць, то на гэта ёсць **(грунтавыя / грунтоўныя)** падставы (*І. Новікаў*).

5. «Не павінен ты **(ганьбаваць / ганьбіць)** маім хлебам-соллю, саколік, калі хочаш мець за жонку маю Зоську…» – не адступала старая (*З. Бядуля*).

**Заданне 3.** Многія фразеалагізмы ўзніклі на вобразнай аснове прыказак. Напрыклад, у выніку скарачэння прыказкі «*Пужаная варона куста баіцца*» ўтварыўся фразеалагізм *пужаная варона*, што мае значэнне 'залішне асцярожны чалавек, які з-за перажытых выпрабаванняў баіцца нават таго, што не пагражае яму небяспекай'.

Вызначце, якія фразеалагізмы ўтварыліся на аснове наступных прыказак:

- *Блізка локаць, ды не ўкусіш.*
- *Крывое кола на сябе бруд кідае.*
- *Старога вераб'я на мякіне не правядзеш.*

Упішыце фразеалагізмы ў табліцу ў адпаведнасці з іх значэннямі.

*Максімальная колькасць балаў – 6*
(2 балы – за кожны правільна вызначаны фразеалагізм).

| Значэнне фразеалагізма | Фразеалагізм |
|---|---|
| 'упарты чалавек, які сваімі ўчынкамі пляміць сам сябе' | |

| 80 (асоба) | |
|---|---|

**Заданне 6.** Прачытайце радкі з беларускай народнай песні «Ой, вясна ды й весенка, ды й весенка». Запішыце выдзеленыя дзеясловы ў форме 2-ой асобы множнага ліку цяперашняга часу.

*Максімальная колькасць балаў – 5*
(1 бал за кожнае правільна напісанае слова).

– Ой, вясна ды й весенка, ды й весенка,
Што ты нам прынеселка, прынеселка?...

Маладым малодкам – красёнцы *ткаць*,
А дзевачкам – ды й палотны *бяліць*,
Малым дзеткам з яечкамі гуляць,
Старым дзядкам – на мураўцы *сядзець*,
Маладым мужчынкам – поле *араць*,
А хлопчыкам – на пастку *гнаць*.

| **Неазначальная форма дзеяслова** | **Форма 2-ой асобы множнага ліку** |
|---|---|
| ткаць | |
| бяліць | |
| сядзець | |
| араць | |
| гнаць | |

**Заданне 7.** Ці ўважліва Вы чытаеце падручнік[1]?

Замест шматкроп'я ўстаўце прапушчаныя словы ці словазлучэнні, сфармуляваўшы праяўленне залежнасці паміж часткамі ў складаназлучаным сказе.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

«Састаўныя часткі складаназлучанага сказа могуць быць адносна самастойныя, раўнапраўныя, а могуць залежаць адна ад адной. Калі яны раўнапраўныя, незалежныя, іх можна памяняць месцамі, і сэнс такога сказа не змяніцца. Напрыклад: *1. Шуміць вада на грэблі пад мастом, ды сонна шэпча ссохлая трава* (М. Танк). *(Параўн.: Сонна шэпча ссохлая трава, ды шуміць вада на грэблі пад мастом.) 2. Паабапал жвірыстай дарогі калышацца леташні быльнік, і веснавая шырыня вее над неабдымным полем* (К. Чорны). (*Параўн.: Веснавая шырыня вее над неабдымным полем, і паабапал жвірыстай дарогі калышацца леташні быльнік.*)

Калі другая частка граматычна залежыць ад першай, вынікае з першай, такія

[1] Цытуецца па: *Беларуская мова : вучэб. дапам. для 9-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / Н. М. Гардзей, П. Л. Навіцкі, З. М. Тамашэвіч ; пад рад. Н. М. Гардзей. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2011. С. 36.*

| | |
|---|---|
| ˋперажываць, шкадаваць з прычыны чагосьці няздзейсненага, непапраўна страчанагаˋ | |
| ˋне перахітруеш, не абдурыш, не ашукаешˋ | |

**Заданне 4.** Вызначце, як утварыліся аўтарскія наватворы.

*Максімальная колькасць балаў – 4*
(0,5 бала за кожную правільна вызначаную ўтваральную аснову,
0,5 бала за кожны правільна вызначаны спосаб утварэння).

1. *Ахапісты* смялее ветравей… (Р. Барадулін).
2. Лягла імгла на паплавах… І адчыняецца вачам праглынь і вечнае перастварэнне *звышнябёсаў*… (Я. Чыквін).
3. І застылі дзве хваіны ў полі *кветкарунным* (П. Трус).
4. *Вечназялёніцца* ойчы наш край (К. Камейша).

| Аўтарскі наватвор | Утваральная аснова | Спосаб словаўтварэння |
|---|---|---|
| **Узор:** *скурганіць* | *курган* (□) | *прыставачна-суфіксальны:* с-курган + і(ць) |
| *ахапісты* | | |
| *звышнябёсы* | | |
| *кветкарунны* | | |
| *вечназялёніцца* | | |

**Заданне 5.** Прачытайце тэкст. Утварыце і запішыце колькасна-іменныя спалучэнні.

*Максімальная колькасць балаў – 5*
(1 бал за кожнае правільна запісанае колькасна-іменнае спалучэнне).

Беларускі мастак Аляксандр Кішчанка занесены ў Кнігу рэкордаў Гінэса як аўтар самага вялікага габелена ў свеце. Маштабнасць яго твора сапраўды ўражвае: гэта палатно 14×19 м, вагой пад 300 кг, агульная даўжыня ніткі – 806 км. Габелен ткаўся ўручную 4 (год). На ім адлюстравана больш за 80 вядомых (асоба).

| Лік | Колькасна-іменнае спалучэнне |
|---|---|
| 14×19 м | |
| 300 кг | |
| 806 км | |
| 4 (год) | |

перастаноўкі немагчымы. Залежнасць другой (ці другіх) часткі ад першай праяўляецца:

- у наяўнасці ў другой частцы (____________________)[1] і (____________________)[2], якія замяняюць асобныя словы першай часткі;
- у парадку слоў (__________________)[3] часткі адносна (____________________)[4];
- у наяўнасці (__________________ __________________)[5], які аб'ядноўвае гэтыя часткі ў адно цэлае».

**Заданне 8.** Вызначце, якія цвёрдыя формы вершаў выкарысталі паэты, і запішыце назвы гэтых форм у адпаведным слупку табліцы.

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

| **Вершы** | **Цвёрдая форма верша** |
|---|---|
| Час брыльянцісты, залацісты<br>Імчыцца ў даль, як дзікі конь,<br>А мы на ім – убор квяцісты.<br>Час брыльянцісты, залацісты<br>Настрой у сэрцы паліць чысты,<br>У нашым поглядзе агонь.<br>Час брыльянцісты, залацісты<br>Імчыцца ў даль, як дзікі конь.<br>*Уладзімір Дубоўка* | |
| Я думаў, больш не прыйдзе да мяне<br>Каханне з цудадзейнасцямі тымі,<br>Што юнакоў – пытальнікамі гне,<br>А пасівелых – робіць маладымі.<br>Каханне, думаў, вусны мне замкне,<br>Шлях перайшоўшы з вёдрамі пустымі.<br>Няма, напэўна, горай пакарання,<br>Калі не свеціць над табой каханне.<br>*Анатоль Грачанікаў* | |
| Бы схаваную ў кветкі мелодыю,<br>Шукаюць настойліва пчолы,<br>Я лаўлю гэты цуд вясёлы,<br>Бы схаваную ў кветкі мелодыю.<br>Я не бачу нікога наўкола,<br>Я сам-насам сягоння з прыродаю –<br>Бы схаваную ў кветкі мелодыю,<br>Шукаюць настойліва пчолы.<br>*Янка Сіпакоў* | |
| Як гэты свет, як і сябе, хутчэй,<br>Прыдумаў кожны сам сваё каханне.<br>Адчуўшы шэпту цёмнае дыханне,<br>Бяссонніцу спакушаных вачэй. | |

| | |
|---|---|
| Страх замятаецца завеяй вей.<br>Грахі замольвае замілаванне.<br>Бяжыць, сябе не помнячы, спатканне,<br>І нецярпенне цвеліць салавей.<br>У пагасцінцы запрашаюць высі.<br>І кожны жарсць, як у далонях жар,<br>Нясе, не баючыся апячыся,<br>Сябе растрачваючы без астатку.<br>Урэшце тужыць сцюжа, чахне сквар.<br>І можна зноў ашуквацца. Спачатку.<br>*Рыгор Барадулін* | |

**Заданне 9.** Устанавіце адпаведнасць паміж апісаннямі персанажаў твораў беларускіх пісьменнікаў (у першым слупку) з назвай твора і аўтарам (у другім слупку). Адказ запішыце як спалучэнне літар і лічбаў. Напрыклад: ***А2, Б1, В3***.

У трэцім слупку напішыце героя, пра якога ідзе гаворка ў першым слупку.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| **Апісанне персанажа** | **Твор і яго аўтар** | **Пра якога героя ідзе гутарка** |
|---|---|---|
| **А**<br>З выгляду абыякавы да ўсяго, <…> разгублена заміргаў пад акулярамі блізарукімі вачыма, няспрытна ўзняўся з долу і, заікаючыся ад хвалявання, хутка-хутка загаварыў. <…> На момант старшыне чамусьці стала шкада таго вучонага, разумнага чалавека, непрызвычаенага да нягод ваеннага жыцця, слабага і кволага. | **1**<br>"Паром на бурнай рацэ" Уладзіміра Караткевіча | |
| **Б**<br>Яго нахабныя і страшныя вочы гарэлі вясёлым шаленствам. <…> Чалавек, які сядзіць насупроць <…>, – страшны, вельмі небяспечны чалавек, драпежнік, у якога, пэўна, зусім няма ў душы месца для так званых пакут сумлення… | **2**<br>"Дзяльба кабанчыка" Віктара Карамазава | |
| **В**<br><…> Руку падаў і больш – ані знаку, што рады сустрэчы з домам, з маці. Але гэта адно – першая | **3**<br>"Жураўліны крык" Васіля Быкава | |

| | | |
|---|---|---|
| хвіліна. Потым як глянуў маці ў вочы, <...> сэрца скранулася: сунуўся халодным носам у матчын твар, пацалаваў у шчаку. Ад непрывычкі засаромеўся сваіх раптоўных пачуццяў – адхінуўся, апусціў вочы, быццам не ведаў,як апраўдацца. | | |

ЛІТАРНА-ЛІЧБАВАЯ АДПАВЕДНАСЦЬ: ______________________________

**Заданне 10.** Прачытайце верш Петруся Броўкі "Прыходзь, прыходзь жа раніцой…" і запоўніце табліцу.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

Прыходзь, прыходзь жа раніцой,
Як толькі дзень займаецца.
Пабачыш ты, мая любоў,
Як сонца разгараецца.
Прыходзь, прыходзь жа поўным днём,
Сваё мне шчасце дорачы,
Пабачыш ты, мая любоў, –
Аж сэрцу ў грудзях горача.
Прыходзь жа позна і ў заход,
Як сонейка закоціцца.
Пабачыш ты, мая любоў,
Што ажно плакаць хочацца.

| | |
|---|---|
| 1. Які памер верша ў першай страфе? | |
| 2. Які тып рыфмоўкі выкарыстаў паэт у першай страфе? | |
| 3. Да якой разнавіднасці лірыкі можна аднесці гэты твор? | |
| 4. Сфармулюйце адным словам тэму верша? | |
| 5. Якая рытарычная фігура выкарыстана паэтам у трэцім радку кожнай страфы? | |

8800